ISSN 0321-1649 (print)

# *ГІСТОРЫЯ*

HISTORY

УДК 327(476:4-470)"1922"

Паступіў у рэдакцыю 13.10.2015
Received 13.10.2015

**В. М. Бароўская**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

## ДЗЕЙНАСЦЬ КАМІСІІ ПА АЦЭНЦЫ СТРАТ, НАНЕСЕНЫХ ЭКАНОМІЦЫ БССР ПОЛЬСКАЙ АРМІЯЙ І АКУПАЦЫЙНЫМІ ЎЛАДАМІ

После заключения Рижского мирного договора в марте 1921 г. руководство БССР было вынуждено решать проблему экономического восстановления народного хозяйства, возвращения вывезенного имущества, поиска внутренних и внешних финансовых ресурсов. Если вопрос реэвакуации более или менее решался при помощи созданной в мае 1921 г. Польско-российско-украинской реэвакуационной комиссии, то вопрос компенсации потерь, нанесенных польскими войсками и оккупационными властями, просто повисал в воздухе. Процесс определения точной цифры потерь начался только в начале 1922 г. и был инициирован Народным комиссариатом иностранных дел РСФСР. Именно в это время 21 января 1922 г. Постановлением СНК БССР была создана Специальная комиссия по оценке потерь, нанесенных действиями польской армии и оккупационными властями государству, частным лицам и учреждениям на территории БССР. Комиссия по оценке потерь действовала в условиях слабого финансирования, неподготовленности технического персонала. Ее деятельность была ограничена во времени и возможностях. Потери по республике составили 9 млрд 34 млн 208 тыс. 319 советских руб., или 52 млн 29 тыс. 281 золотой довоенный руб. и 34 коп.

*Ключевые слова:* ущерб, польско-советская война, польская оккупация, Польско-российско-украинская реэвакуационная комиссия.

**O. N. Borovskaya**

*Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## ACTIVITY OF THE COMMISSION FOR THE EVALUATION OF DAMAGES CAUSED TO THE BSSR ECONOMY BY THE POLISH ARMY AND OCCUPATION AUTHORITIES

After the Treaty of Riga was signed in March 1921, the BSSR leaders had to address the issues of recovering the economy, returning property from abroad and searching for internal and external financial resources. While the issue of re-evacuation was more or less under control through the Polish-Russian-Ukrainian Commission for Re-evacuation established in May 1921, the issue of reimbursement for damages caused by Polish troops and occupation authorities simply hung in the air. The process of determining the exact figure of the damages only started in early 1922. It was initiated by the RSFSR People's Commissariat of Foreign Affairs. At that very time, on 21 January 1922, the BSSR Council of People's Commissariats adopted a resolution to establish the Ad Hoc Commission for the Evaluation of Damages Caused by the Polish Army and Occupation Authorities to the State, Private Persons and Institutions in the Territory of the BSSR. The Commission operated in the conditions of underfunding and low competence of technical personnel and was limited in time and capacity. The total damages to the Republic amounted to 9,034,208,319 Soviet roubles or 52,029,281 pre-war roubles 34 kopecks.

*Keywords:* damage, Polish-Soviet War, Polish occupation, Polish-Russian-Ukrainian Re-evacuation Commission.

Польска-савецкі ваенны канфлікт 1919–1921 гг. быў выкліканы імкненнем кіруючых польскіх колаў да адраджэння Польскай дзяржавы ў межах 1772 г., жаданнем савецкага кіраўніцтва рэалізаваць на практыцы план сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. У выніку ваенных дзеянняў мясцовае насельніцтва і ўся народная гаспадарка БССР у цэлым падвяргаліся частым рабаванням, рэквізіцыям, разбурэнням. Асобныя населеныя пункты, такія як, напрыклад, Барысаў, былі амаль цалкам знішчаны. Многія прамысловыя прадпрыемствы, аб'екты народнай асветы былі разрабаваны, іх абсталяванне было вывезена адступаючымі польскімі войскамі.

© Бароўская В. М., 2017

Зразумела, што пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора ў сакавіку 1921 г. кіраўніцтва БССР было вымушана вырашаць праблему эканамічнага ўзнаўлення народнай гаспадаркі, звароту вывезенай маёмасці, пошуку ўнутраных і знешніх фінансавых рэсурсаў. Калі пытанне рээвакуацыі больш-менш вырашалася пры дапамозе створанай у маі 1921 г. Польска-расійска-ўкраінскай рээвакуацыйнай камісіі, то пытанне кампенсацыі страт, нанесеных польскімі войскамі і акупацыйнымі ўладамі, было нявырашана. Згодна з VIII артыкулам Рыжскага мірнага дагавора, абодва бакі адмаўляліся ад выплаты ваенных страт, якія былі нанесены мірным жыхарам падчас ваенных дзеянняў і аперацый [1, с. 627].

Працэс вызначэння дакладнай лічбы страт быў распачаты толькі ў пачатку 1922 г. і ініцыяваны Народным камісарыятам замежных спраў РСФСР. Менавіта ў гэты час, 21 студзеня 1922 г. Пастановай СНК БССР была створана Спецыяльная камісія па ацэнцы страт, нанесеных дзеяннямі польскай арміі і акупацыйнымі польскімі ўладамі дзяржаве, прыватным асобам і ўстановам на тэрыторыі БССР (далей – Камісія па ацэнцы страт). Асноўнай прычынай стварэння Камісіі па ацэнцы страт з’явілася неабходнасць контраргумента эканамічным прэтэнзіям, выстаўленым польскай дэлегацыяй на пасяджэннях Польска-расійска-ўкраінскай рээвакуацыйнай камісіі (ПРУРК). Вынікі яе працы разглядаліся ў якасці надзейнага сродку змяншэння фінансава-эканамічных прэтэнзій, выстаўленых краінамі Антанты да Савецкай Расіі на Генуэзскай канферэнцыі і іншых міжнародных сустрэчах.

Цікава, што айчынная гістарыяграфія амаль цалкам не закранае пытанне дзейнасці Камісіі па ацэнцы страт. У савецкай гістарычнай навуцы 1919 – пачатку 1940-х гг. [2−5] аўтары, імкнучыся паказаць разбуральны характар польскай акупацыі, прыводзяць агульныя лічбы страт па ўсёй рэспубліцы. Такім чынам, па-за ўвагай застаюцца механізм іх падліку і рэгіянальная дэталізацыя. Часта аўтары, якія вывучаюць гэты перыяд, ставяць знак роўнасці паміж Камісіяй па ацэнцы страт і Беларускім таварыствам садзейнічання ахвярам інтэрвенцыі 1917–1920 гг., якія хоць і ставілі аднолькавыя мэты, аднак існавалі ў розны адрэзак часу. Аналагічную сітуацыю сустракаем і ў зборніку “Белоруссия в борьбе против польских захватчиков в 1919–1920 гг.” [6], які пабачыў свет у 1940 г. Айчынныя даследчыкі сярэдзіны 1940 – канца 1980-х гг. [7−8] у большасці сваёй карысталіся лічбамі, уведзенымі ў навуковы ўжытак іх папярэднікамі.

У склад Камісіі па ацэнцы страт уваходзілі прадстаўнікі (старшыні) ад цэнтральных ведамстваў БССР – Народнага камісарыята юстыцыі БССР, Народнага камісарыята ўнутраных спраў БССР, Народнага камісарыята земляробства БССР, Рабоча-сялянскай інспекцыі, Цэнтральнага статыстычнага таварыства. Узначальваў камісію кіраўнік статыстычнага ведамства БССР – М. І. Шкубер (1922–1927 гг.).

Камісія па ацэнцы страт складалася з Цэнтральнай камісіі, шасці павятовых камісій, якія ў сваю чаргу дзяліліся на сто шаснаццаць валасных камісій. Згодна з праектам Палажэння аб Камісіі па ацэнцы страт, у склад павятовых камісій павінны былі ўваходзіць члены павятовага выканаўчага камітэта. Абавязковай умовай існавання валасных камісій з’яўлялася наяўнасць сярод яе членаў трох супрацоўнікаў валаснога выканаўчага камітэта. Пры гэтым валасныя камісіі мелі права разглядаць толькі справы аб стратах, нанесеных сялянскім гаспадаркам, якія знаходзіліся ў межах воласці. Калі ж справа датычылася разгляду страт, нанесеных сельскагаспадарчым і прамысловым прадпрыемствам той жа самай воласці, то гэта пытанне павінна была вырашаць павятовая камісія [9, арк. 2–3].

Праца павятовых і валасных камісій была падзелена на тры этапы: устанаўленне факта страт – усталяванне сувязі паміж стратамі і дзеяннямі польскай арміі і акупацыйных улад – ацэнка страт [9, арк. 2–3]. Пры гэтым у працэсе ўстанаўлення факта страт прызнавалася неабходным наяўнасць або рэквізацыйных квітанцый польскіх ваенных, або паказанняў сведак. Доказамі страт таксама маглі выступіць пратаколы, складзеныя савецкімі ўладамі адразу пасля адыходу польскіх войскаў. Сапраўднымі прызнаваліся і выпіскі з кніг земскіх і гарадскіх упраў, казённых палат і казначэйства, куды заносіліся страты, атрыманыя ў выніку знішчэння нерухомай маёмасці.

Разгляд справы ацэнкі страт праходзіў у рамках публічных пасяджэнняў, куды афіцыйна, праз павестку, выклікаліся пацярпелыя, сведкі, эксперты. У выніку працы выносіўся прысуд, які мог быць абскарджаны на працягу двух тыдняў у судзе. Для паскарэння справы ацэнкі рэкамендавалася пацярпелым мець на руках ацэначныя дакументы (страхавыя полісы, акладныя лісты, спраўкі аб ацэнцы Земскай Гарадской казённай палаты) [9, арк. 93–93 адв.]. Вынікам працы камісіі па ацэнцы страт павінна была стаць агульная ведамасць, куды заносіліся б лічбы з шасці

паветаў, уваходзячых у склад БССР [9, арк. 2–3]. Пры гэтым страты павінны быць прадстаўлены ў даваеннай, царскай валюце. Перавод лічбаў з савецкіх грошай на царскія выклікаў складанасць і патрабаваў ад супрацоўнікаў павятовых і валасных камісій ведання коштаў даваеннага рубля ў савецкіх знаках памесячна за другую палову 1919 г. і студзень–ліпень 1920 г. [9, арк. 170].

16 лютага 1922 г. была зацверджана Пастанова УЦВК РСФСР аб рээвакуацыі маёмасці РСФСР з Польшчы. Згодна з гэтым дакументам, у адпаведнасці з умовамі Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. расійска-ўкраінскі бок мог на правах узаемнасці патрабаваць ад Польшчы звароту і рээвакуацыі ўсёй маёмасці, вывезенай у перыяд з 1914 па 1920 г. як польскімі, так і нямецкімі ўладамі з тэрыторыі РСФСР *(і БССР*). Менавіта па гэтай прычыне ўсім павятовым камісіям па ацэнцы страт прадпісвалася неадкладна пачаць збор статыстычнага матэрыялу і накіроўваць яго на адрас Народнага камісарыята замежных спраў РСФСР. Асаблівую ўвагу неабходна было звярнуць на зону пагранічнай паласы [9, арк. 44–45]. Такім чынам, звесткі, якія паступалі ад камісій па ацэнцы страт, з'яўляліся каштоўнай крыніцай інфармацыі для працы Польска-расійска-ўкраінскай рээвакуацыйнай камісіі.

У адпаведнасці з Пастановай УЦВК РСФСР аб рээвакуацыі маёмасці РСФСР з Польшчы прадпісвалася "ўсім дзяржаўным установам і грамадскім аб'яднанням, якія валодаюць якім-небудзь матэрыялам, даказваючым факт вывазу маёмасці на тэрыторыю Польшчы, тэрмінова яго прадставіць у Народны камісарыят замежных спраў". Гэта таксама датычылася кіраўніцтва пагранічных павятовых выканаўчых камітэтаў. Даказаць факт вывазу маёмасці можна было як рэквізацыйнымі паперамі, так і пры дапамозе паказанняў сведак (пісьмовых або вусных), завераных натарыяльна ў аддзелах мясцовых органаў юстыцыі.

Згодна з заданнямі Камісіі па ацэнцы страт, усе страты былі падзелены на некалькі ключавых груп. Першая вялікая група датычылася гарадоў: сюды ўключаліся ўсе страты, нанесеныя гаспадарцы ад разбурэнняў будынкаў, з-за адсутнасці рамонту (муніцыпальныя пабудовы, асабістыя дамы), ад ваеннага пастою. Другая група была разлічана на прамысловыя прадпрыемствы: тут знаходзіліся страты, нанесеныя з-за адсутнасці рамонту, ад невытворчага выкарыстання (перарасход вады), ад неатрымання даходаў ад вытворчасці прадпрыемстваў. Трэцяя група ўключала дарожныя страты (грунтавыя, маставыя, шашэйныя, масты). У чацвёртую групу былі ўключаны агульнабюджэтныя страты гарадской і земскай гаспадаркі за 1914–1917 гг. (падзенне даходаў, расходы на ваенныя патрэбы, асігнаванні Усерасійскаму Саюзу гарадоў і Земскаму саюзу) [9, арк. 88–88 адв.]. Акрамя гэтага, усе страты былі падзелены на дзве групы – тыя, якія былі нанесены польскімі войскамі і акупацыйныі ўладамі, і тыя, якія з'явіліся вынікам бандыцкіх налётаў. У другую групу прапаноўвалася ўключыць страты, нанесеныя войскамі С. Н. Булак-Балаховіча, С. В. Пятлюры. У ходзе працы камісій па ацэнцы страт складаліся акты аб нанесеных стратах або згубах, абавязкова ў прысутнасці пацярпелага, сведак і экспертаў. У акце павінны былі пазначацца месца, дзе адбылося рабаванне, з дакладным вызначэннем вёскі, воласці, павета; прозвішча, імя пацярпелага, прычына нанесенай страты, дакладная назва прадметаў, іх колькасць у пудах ці іншых адзінках вымярэння, прыкладная сума страты ў рублях даваеннага часу [9, арк. 396].

Камісія павінна была скончыць сваю працу да 15 красавіка 1922 г. Зразумела, падлічыць за такі кароткі адрэзак часу ўсе страты было вельмі складана. Паступалі неаднаразовыя запыты ад Народнага камісарыята замежных спраў РСФСР на адрас Камісіі па ацэнцы страт з патрабаваннямі паскорыць працу і прадставіць агульную лічбу страт [9, арк. 24, 27]. Пры гэтым многія старшыні павятовых і валасных камісій пры накіраванні вынікаў працы адзначалі, што "прадстаўленыя звесткі не могуць лічыцца дакладнымі, паколькі былі сабраны ў вялікай спешцы" [9, арк. 36]. У канцы красавіка 1922 г. на адрас Слуцкай валаснай камісіі нават паступіла патрабаванне прадставіць агульную лічбу страт, нанесеных польскімі войскамі, незалежна ад колькасці пададзеных заяў і разгледжаных спраў [9, арк. 162].

Пры гэтым патрабавалася не ўключаць у гэту лічбу дарожныя, чыгуначныя, паштовыя страты, якія ўжо былі ўлічаны Рабоча-сялянскай інспекцыяй РСФСР.

Народны камісарыят замежных спраў РСФСР у шматлікіх інструкцыях і тэлеграмах, накіраваных на адрас Цэнтральнай камісіі па ацэнцы страт, раіў звярнуць большую ўвагу на страты, нанесеныя ў пагранічнай паласе. Справа ў тым, што гэтая тэрыторыя фактычна не падпарадкоўвалася савецкай уладзе. Да канца працы Змешанай пагранічнай камісіі (ліпень 1922 г.) на ёй знаходзіліся не

толькі савецкія вайсковыя часці, але і польскія фарміраванні. Камісія па ацэнцы страт павінна была правесці абследаванне пагранічнай тэрыторыі на прадмет незаконнай высечкі лясоў, ажыццяўлення рабаванняў [9, арк. 285]. Супрацоўнікам павятовых і валасных камісій прадпісвалася скласці акт па ацэнцы страт, куды ўносіліся прозвішча і імя пацярпелага, назва населенага пункта, прычына страты, дакладны пералік усіх рэквізаваных прадметаў (у адзінках вагі), прыкладная сума страты ў даваенных рублях [9, арк. 396]. Складзеныя акты па ацэнцы неабходна было накіроўваць у Змешаную пагранічную камісію, у функцыі якой уваходзіла вырашэнне пагранічных канфліктаў.

Складанасці ў працу Камісіі па ацэнцы страт уносіла і слабая падрыхтаванасць персаналу, яго нізкая адукаванасць. Для павышэння эфектыўнасці камісіі прадугледжвалася стварыць і распаўсюдзіць падрабязныя інструкцыі і формы справаводства. Гэтыя мерапрыемствы, згодна з планамі, павінны былі стаць сродкам актывізацыі і паскарэння справы [9, арк. 177–178]. Для гэтай мэты была склікана нарада-семінар з прадстаўнікоў павятовых камісій, дзе былі зняты шматлікія спрэчныя моманты, выпрацаваны адпаведныя бланкі і формы, прынята рашэнне аб мерах па большай інфармаванасці насельніцтва (расклейванне насценных газет і аб'яў на вуліцах населеных пунктаў) [10, арк. 8].

Цяжкасці ў працу Камісіі па ацэнцы страт уносіла слабае фінансаванне. Вострая неабходнасць аплаты працы абслугоўваючага персаналу рабіла справу падліку дастаткова складанай [10, арк. 69]. Так, напрыклад, супрацоўнікі Барысаўскай павятовай камісіі не атрымоўвалі заработнай платы на працягу амаль шасці месяцаў. Многія з іх вырашалі справу звальненнем, некаторыя вымушаны былі працягваць працу ў камісіях, аднак адносіліся да выканання сваіх службовых абавязкаў абыякава, без інтузіязму.

Некаторая пасіўнасць працы павятовых камісій тлумачылася не толькі слабым фінансаваннем, але і адсутнасцю дакументальных даных, якія пацвярджалі б факт рабавання. Так, за перыяд 1920–1921 гг. звесткі былі зусім нязначныя: адсутнічалі вопісы знішчанай маёмасці, а арганізацыя збору інфармацыі натыкалася на адсутнасць неабходнага тэхнічнага персаналу [9, арк. 274]. Асабліва востра гэтая праблема стаяла ў Барысаўскім павеце. Тут наогул адсутнічалі якія-небудзь звесткі аб рабаваннях. Згодна з справаздачай канца лютага – пачатку сакавіка 1922 г. старшыні павятовай камісіі, збор дакументальных даных сутыкаўся яшчэ і з індыферэнтнымі паводзінамі мясцовага насельніцтва, у якога адсутнічала надзея на факт атрымання якой-небудзь кампенсацыі. Сотні павестак, накіраваных камісіямі павета пацярпелым, не знаходзілі водгуку.

Таму становіцца цалкам зразумела, чаму падвесці вынікі працы Камісіі па ацэнцы страт удалося толькі ў жніўні 1922 г. Менавіта ў гэты час на адрас Народнага камісарыята замежных спраў паступіла справаздача камісіі, у якой былі ўказаны ўсе лічбы, з пералікам на царскія, даваенныя рублі, керанкі. Так, па рэспубліцы страты складалі 9 млрд 34 млн 208 тыс. 319 савецкіх руб., або 52 млн 29 тыс. 281 залатых даваеных руб. і 34 кап. [9, арк. 365].

**Агульная зводка сум страт, нанесеных польскай арміяй і акупацыйнымі ўладамі дзяржаве, установам і прыватным асобам на тэрыторыі БССР [9, арк. 2]**

**Summary of the amounts of damages caused by the Polish army and occupation authorities to the state, institutions and private persons in the BSSR [9, p. 2]**

| Назва камісіі | У залатой даваеннай валюце | | У савецкіх рублях 1919–1920 гг., руб. | У мікалаеўскай валюце, руб. крэд. | Польскімі маркамі, марак | Думскімі, руб. | Керанкамі, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | руб. | кап. | | | | | |
| Цэнтральная і Мінская павятовая камісіі | 13.763.167 | 34 | 914.004.549 | 38.752.666 | 77.175.619 | 378.350 | 148.200 |
| Бабруйская павятовая камісія | 10.037.326 | 64 | – | – | – | – | – |
| Барысаўская | 3.254.392 | 14 | 8.120.202.500 | – | – | – | – |
| Ігуменская | 1.744.623 | 82 1/5 | 1.300 | – | – | – | – |
| Мазырская | 19.721.488 | 56 | – | – | – | – | – |
| Слуцкая | 3.508.222 | 84 | – | 22.747 | – | – | – |
| Усяго | 52.029.281 | 94 ½ | 9.034.208.319 | 38.775.413 | 77.175.619 | 378.350 | 148.200 |

Камісія па ацэнцы страт, нанесеных дзеяннямі польскай арміі і акупацыйнымі польскімі ўладамі дзяржаве, прыватным асобам і ўстановам на тэрыторыі БССР, дзейнічала ва ўмовах слабага фінансавання, непадрыхтаванасці тэхнічнага персаналу. Яе дзейнасць была значна абмежавана па часе і магчымасцях. Сабраны статыстычны матэрыял камісіі па ацэнцы падлягае верыфікацыі і пераправерцы. Таму не дзіўна, што яе паслядоўнікі, такія як, напрыклад, Беларускае таварыства садзейнічання ахвярам інтэрвенцыі, ацэньвалі працу камісіі як малаэфектыўную, сабраны матэрыял кваліфікавалі як "малапрыдатны для выкарыстання" [11, арк. 97].

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Документы внешней политики СССР : в 24 т. / редкол.: Г. А. Белов [и др.]. – М., 1959. – Т. 3 : 1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г. – 723 с.
2. Шчарбакоў, В. К. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і белапольская акупацыя / В. К. Шчарбакоў. – Мінск : Белдзярж. выд-ва, 1930. – 127 с.
3. Зимионко, А. Оккупация и интервенция в Белоруссии / А. Зимионко. – М. : Изд-во Всесоюз. о-ва политкаторжан и ссыльных поселенцев, 1932. – 46 с.
4. Лочмель, И. Ф. Освобождение Белоруссии от Белопольских оккупантов / И. Ф. Лочмель. – Минск : Госиздат Белоруссии, 1939. – 51 с.
5. Зюзькоў, А. Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі / А. Зюзькоў. – Мінск : Белдзяржвыд, 1931. – 86 с.
6. Белоруссия в борьбе против польских захватчиков 1919–1920 гг / сост. О. Шекун, Р. Кроль, Н. Трусова. – М. : Госполитиздат, 1940. – 192 с.
7. Каменская, Н. В. Белорусский народ в борьбе за советскую власть / Н. В. Каменская. – Минск : Изд-во АН БССР, 1963. – 263 с.
8. Шкляр, Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюции (1919–1920 гг.) / Е. Н. Шкляр. – Минск : Гос. изд-во БССР, 1962. – 176 с.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 9. Воп. 1. Спр. 1.
10. НАРБ. – Ф. 9. Оп. 1. Д. 52.
11. НАРБ. – Ф. 9. Оп. 1. Д. 6б.


## References


1. Belov G. A., Gromyko A. A. (ed.), Dokumenty vneshnei politiki SSSR : v 24 t. T. 3. (1 iiulia 1920 g. – 18 marta 1921 g.) [The USSR Foreign Policy Documents: in 24 Vols. Volume 3. (July 1, 1920 – March 18, 1921)], Gospolitizdat, Moscow, RU, 1959.
2. Shcharbakoў V. K., Kastrychnitskaia revaliutsyia na Belarusi i belapol'skaia akupatsyia [The October Revolution in Byelorussia and the Polish Occupation], Beldziarzhvyd, Minsk, BY, 1930.
3. Zimionko A., Okkupatsiia i interventsiia v Belorussii [The Occupation and Intervention in Byelorussia], Izdatel'stvo Vsesoiuznogo obshchestva politkatorzhan i ssyl'nykh poselentsev, Moscow, RU, 1932.
4. Lochmel' I. F., Osvobozhdenie Belorussii ot Belopol'skikh okkupantov [The Liberation of Byelorussia from Polish Invaders], Gosizdat Belorussii, Minsk, BY, 1939.
5. Ziuz'koў, A. Kryvavy shliakh belaruskai natsdemakratyi [The Bloody Way of Byelorussian National Democrats], Beldziarzhvyd, Minsk, BY, 1931.
6. Shekun O., Krol' R., Trusova N. (comp.), Belorussiia v bor'be protiv pol'skikh zakhvatchikov 1919–1920 gg [Byelorussia in the Struggle against Polish Invaders in 1919–1920], Gospolitizdat, Moscow, RU, 1940.
7. Kamenskaia N. V., Belorusskii narod v bor'be za sovetskuiu vlast' [The Byelorussian People in the Struggle for the Soviet Power], Izdatel'stvo AN BSSR, Minsk, BY, 1963.
8. Shkliar E. N., Bor'ba trudiashchikhsia Litovsko-Belorusskoi SSR s inostrannymi interventami i vnutrennei kontrrevoliutsii (1919–1920 gg.) [The Struggle of the Lithuanian-Byelorussian SSR with Foreign Intervention and Internal Counter-revolution (1919–1920)], Gosudarstvennoe izdatel'stvo BSSR, Minsk, BY, 1962.
9. Natsyianal'ny arkhiў Respubliki Belarus' (NARB) [National Archives of the Republic of Belarus (NARB)], F. 9., Vop. 1., Spr. 1.
10. NARB [NARB], F. 9., Op. 1., D. 52.
11. NARB [NARB], F. 9., Op. 1., D. 6b.


## Информация об авторе

*Боровская Ольга Николаевна* – канд. ист. наук, науч. сотрудник. ГНУ «Институт истории НАН Беларуси» (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail : borovskaya-olga@mail.ru.

## Information about the author

*Borovskaya Olga Nikolaevna,* Ph. D. (Hist.), Scientific Researcher, Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: borovskaya-olga@ mail.ru.

## Для цитирования

Бароўская, В. М. Дзейнасць Камісіі па ацэнцы страт, нанесеных эканоміцы БССР польскай арміяй і акупацыйнымі ўладамі / В. М. Бароўская // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 2. – С. 36–40.

## For citation

Borovskaya O. N. Activity of the Commission for the Evaluation of Damages Caused to the BSSR Economy by the Polish Army and Occupation Authorities. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no. 2, pp. 36–40.